## **Чарнабрывы каралёк**

Карагод-гульня

Чарнабрывы каралёк край гарода ходзіць.[1]
Чарнабрывы каралёк, пажалуйце ў гарадок.
Чарнабрывы каралёк, у бокі вазьміся,
Чарнабрывы каралёк, нізенька ўкланіся,
Чарнабрывы каралёк, устань, прымудрыся,
Чарнабрывы каралёк, красіва ўбярыся,
Чарнабрывы каралёк, у бокі вазьміся,
Чарнабрывы каралёк, нізенька ўкланіся.

З гульцоў дзяўчаты абіраюць адну, якая становіцца ў цэнтры кола. Яна – “чарнабрывы каралёк” – танчыць у цэнтры кола, астатнія гульцы рухаюцца ў карагодзе насустрач сонцу. Усе выконваюць тое, пра што пяецца ў тэксце.

Запісаў Басаў Р.Ц. у 2006 г. у в. Гадзічава ад Зайцавай Анастасіі Нікіфараўны 1926 г.н., Лапека Варвары Агееўны, 1910 г.н., Зайцавай Марыі Іванаўны, 1921 г.н., Лаўровай Марыі Нікіфараўны, 1924 г.н., Басавай Таццяны Сяргееўны, 1934 г.н., Зайцавай Марыі Андрэеўны, 1937 г.н.

[1] Кожная страфа выконваецца двойчы.